✓**4 траўня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася практычная канферэнцыя «Электронная культура» па тэме **«Рэальнасць і віртуальнасць ва ўмовах пандэміі»**. Арганізатарамі выступілі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і НББ. Абмяркоўвалася тэматыка стану і перспектываў развіцця праектнай дзейнасці па захаванні і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў віртуальнай прасторы, інавацыйныя тэхналогіі ў сферы культуры («воблачныя», мабільныя, 3D-тэхналогіі ды інш.), фармаванне электроннага кантэнту і распрацоўка віртуальных паслугаў у сферы культуры ды інш. тэмы.